**Няхай** памяць гаворыць… // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2014. — 15 лют. — С. 4.

# НЯХАЙ ПАМЯЦЬ ГАВОРЫЦЬ…

***Афганская вайна (1979–1989 гады) – ваенны канфлікт на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан з аднаго боку ўрадавых сіл Афганістана і Абмежаванага кантынгента савецкіх войск, з другога – шматлікіх узброеных фарміраванняў афганскіх маджахедаў («душманаў»), якія карысталіся палітычнай і фінансавай падтрымкай вядучых дзяржаў НАТА і ісламскага свету.***

Кожны час мае свае адметныя рысы і пакідае свой след у гісторыі. Яна дарогамі памяці вяртае нас у тыя часы. Нагадвае аб людскіх лёсах, апаленых вайной. Чым запомніліся нам васьмідзесятыя гады ўжо мінулага стагоддзя?

У Маскве, сталіцы Савецкага Саюза, праходзілі Алімпійскія гульні. Першамайскія дэманстрацыі гучалі лозунгамі за стваральную працу і мір ва ўсім свеце.

Але не толькі. Разгараўся агонь страшнай, незразумелай, жорсткай вайны ў Афганістане…

Яе галоўнай прычынай стала замежнае ўмяшальніцтва ў афганскі ўнутрыпалітычны крызіс.

Абмежаваны кантынгент савецкіх войск быў уведзены для аказання дапамогі ў стабілізацыі абстаноўкі і магчымасці адбіцца ад агрэсіі звонку. Ён склаў 100 тысяч ваеннаслужачых.

Удзел у баявых дзеяннях прынялі 546255 савецкіх салдат і афіцэраў. Па дадзеных статыстыкі, за 9 гадоў вайны ў Афганістане загінула смерцю храбрых 15,5 тысячы савецкіх салдат. 71 воін стаў Героем Савецкага Саюза. А для нас – героі ўсе, хто прайшоў праз шматлікія выпрабаванні і выканаў інтэрнацыянальны доўг перад Айчынай.

Сёння на тэрыторыі раёна пражываюць 73 воіны-інтэрнацыяналісты. Мы звярнуліся да некаторых з іх і папрасілі ўзгадаць маладыя гады і ваенныя падзеі, якія цяжка ўспамінаць, а не ўспамінаць – нельга.

***Старшы сяржант Васіль Лібоза (узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі):***



– Час Афгана – асаблівы ў маім лёсе. 15 лютага – асаблівая дата. 1985 год. Служба завяршаецца. Ужо лічыш дні і гадзіны, начамі бачыш у сне родную вёску, бацькоў… Здаецца, вось-вось – і будзеш там.

Пад мірным небам. У цішыні. Але загад: знішчыць банду душманаў, што сабраліся ў Чорным кішлаку (Карамагуле). Яго раўнялі з зямлёй мы двойчы і двойчы ён быў узноўлены. Праз кішлак праходзілі дзве цясніны, і гэта цанілі маджахеды, размяшчалі там склады з боепрыпасамі.

Нас, пехацінцаў, у гадзіну ночы накіравалі праз горы да кішлака. Разведчыкаў высадзілі з вяртушак у гарах, каб тыя перакрылі шлях для адступлення. Аперацыя па ачыстцы пачалася раніцай. Я, узводны і прапаршчык пайшлі па цясніне і нарваліся на засаду.

Ад радасці, што нас толькі трое, душманы лютавалі. Узводны атрымаў смяротную кулю ў галаву. Я, паранены, метраў 300 цягнуў яго на сабе. У нас быў няпісаны закон: сваіх не пакідаць. Сілы былі на зыходзе. А на поясе ў мяне 6 гранат. Я ўжо вырваў чэку, каб не здацца ў палон і не стаць ахвярай для здзекаў.

І тут, быццам з неба спусціўся анёл: з’явіўся Мікалай Война – зямляк, замастачанін. Яму я павінен за жыццё. Далей быў палкавы шпіталь, дэмбель. І дата – 15 лютага – мой новы дзень нараджэння, смерць сябра Аляксандра Катаева, апошні дзень вываду савецкіх войск з Афганістана.

***Капітан Яўген Сакалоўскі (узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі):***



– Вайна – гэта старашная і брудная справа. Аднак да яе прывыкаеш, ідзеш як на работу. Практычна на працягу ўсёй службы ў Афганістане даводзілася выконваць адну пастаўленую перад намі задачу – суправаджаць калоны «наліўнікоў». Напрыклад, з Савецкага саюза паступае 100 машын з газай для верталётаў.

Камазы са спецыяльна абсталяванымі кузавамі, на якія пагружана па тры бочкі, аб’ёмам 4-6 кубоў, душманы стараліся абстраляць, абрэзаць хвост калоны, не дапусціць да месца прызначэння.

Наша задача была даставіць гаручае і выжыць у любой сітуацыі. Практычна, на пальцах можна пералічыць выпадкі, калі абыходзілася без перастрэлкі. Гаручае струменілася з ёмкасцяў, іншы раз загараліся машыны. Дарэчы мала калі ўзрываліся. Запоўненая поўнасцю ёмкасць, згодна з законам фізікі, не ўзрываецца.

Ці было страшна? Канечне. Аднак гэта пачуццё садзейнічала другому – самазахаванню: стараліся быць як мага больш пільнымі і падрыхтаванымі да супраціўлення. На маіх вачах мала загінула байцоў, чаму я вельмі рады. Аднак успамінаць той час не проста. Доўгімі вечарамі шмат чытаю, каб як мага менш часу заставалася для сну, у якім часта вяртаюся да перажытага на чужбіне.